# Работа з пластычнымі матэрыяламі

## частка IV

Л. Р. Сячкоўская
старшы выкладчык
кафедры спецыяльнай педагогікі

# План заняткаў

1. Кароткія звесткі аб скульптуры.
2. Інструменты і інвентар для лепкі.

# Кароткія звесткі аб скульптуры

**Скульптура** – від выяўленчага мастацтва, творы якога маюць аб’ёмную форму.

**Скульптура** падзяляецца на **круглую** і **рэльефную** скульптуру.

# Кароткія звесткі аб скульптуры

**Круглая** скульптура апрацоўваецца ўкругава, і такія творы можна агледаць з усіх бакоў.

**Рэльефная** скульптура (**рэльеф**) – гэта такая разнавіднасць скульптуры, калі аб'ёмная выява ствараецца на плоскасці з дапамогай выпукласці, якая часткова выступае па-над плоскасцю фона.

# Віды рэльефу

- **Барэльеф** – скульптурная выява, якая выступае над фонам-плоскасцю нязначна.
- **Гарэльеф** – скульптурная выява, якая выступае над фонам-плоскасцю больш чым напалову.

**Контррэльеф** – гэта паглыблены рэльеф, які атрымліваецца шляхам механічнага адбітку звычайнага рэльефу ў мяккім матэрыяле (гліна, воск) альбо пры зняцці з рэльефу гіпсавай формы.

# Інструменты і інвентар для лепкі

**Нажы** – інструменты, прызначаныя для педагогаў альбо дарослых лепшчыкаў (для вырабу стэкаў, шаблонаў, абрэзвання гліны, фармоўкі і г.д.).

**Стэкі** – палачкі рознай формы даўжынёй ад 10 да 25 сантыметраў і таўшчынёй у сваёй найбольш тоўстай частцы ад 1 да 3 сантыметраў.

# Інструменты і інвентар для лепкі

Канцы **стэкаў** могуць быць самай разнастайнай формы:

- плоскай
- трохвугольнай
- востравугольнай
- закругленай
- круглай і г.д.

# Стэкі бываюць

**Драўляныя** – выраблююцца з дрэва цвёрдых парод: буку, клёну, бярозы, дубу, бэзу і г.д.



# Стэкі бываюць

**Пластмасавыя** – вырабляюцца з пластмасы.



# Стэкі бываюць

**Металічныя** – вырабляюцца з тоўстага меднага, алюмініевага альбо жалезнага дроту.
Іх можна награваць і выкарыстоўваць пры рабоце з пластылінам і воскам.



# Стэкі бываюць

**З металічнымі наканечнікамі** – прызначаны для зрэзвання рэшткаў гліны, вырэзвання глыбокіх месцаў і г.д.




1.
2.
3.
4.
teddydom.livemaster.ru



# Інструменты і інвентар для лепкі

**Падкладная дэнка** (25 – 35 см) – прызначана для лепкі.
**Дыванчык** – прызначаны для раскаткі.
**Паднос** – прызначаны для раздачы лепшчыкам камкоў гліны (драўляны альбо пластмасавы).
**Пэндзаль** – прызначаны для змятання з вырабаў пылу, кавалачкаў гліны, для змывання вырабаў вадой.
**Лінейка і кутнік з дзяленнямі** – прызначаныя для вымярэння шырыні і даўжыні, для правядзення разнастайных гарызантальных і вертыкальных ліній.
**Цыркуль** – прызначаны для вычэрчвання і вымярэння мадэляў.
**Мернік** – прызначаны для вымярэння вышыні разнастайных кропак мадэлі, якія выступаюць над плоскасцю фона.
**Шклянка** – прызначана для вадкасці.
**Анучкі** – прызначаныя для падтрымання чысціні рабочай паверхні і рук.

# Прылады для лепкі з салёнага цеста

- мерны кубачак (для вымярэння колькасці мукі і солі);
- ёмкасць з вадой;
- дэнка для раскатвання цеста;
- маленькая каталка для раскатвання цеста;
- невялічкі нож і стэкі;
- сіта, прыстасаванне для выціскання соку з часнаку;
- пэндзлік для змачвання цеста;
- бляха, фальга;
- рандэлек з вадой і ручнік для рук.

# Прылады для стварэння фактурнага малюнка

- спецыяльныя штампы альбо дробныя побытавыя прадметы, якія астаўляюць на цесце разнастайныя адбіткі, напрыклад:
  – рельефныя гузікі
  – каўпачкі ад фламастараў
  – покрыўкі
  – насадкі для кандытарскага шпрыца
  – палачкі
  – зубачысткі
  – грэбянцы і г.д.

# Літаратура


1. **Алексахин, Н. Н**. Волшебная глина: Методика преподавания лепки в детском кружке: Учебное пособие / Н. Н. Алексахин. – М.: Агар, 2012. – 47 с.
2. **Выгонов, В. В.** Практикум по трудовому обучению: Учеб. пособие для студ. высш. и сред. пед. учеб. заведений / В. В. Выгонов. – М.: Изд. центр «Академия», 1999. – 256 с.
3. **Горичева, В. С.** Сказку сделаем из глины, теста, снега, пластилина: Популярное пособие для родителей и педагогов / В. С. Горичева, М. И. Нагибина. – Ярославль: Академия развития, 2012. – 192 с.
4. **Гусарова, И. Л.** Лепка в детском саду: Лекция для студентов заочников дошкольных факультетов педагогических институтов / И. Л. Гусарова. – М.: ЮНИТИ, 2011. – 86 с.
5. **Казагранда, Брижит**. Поделки из соленого теста / Бриджит Казагранда. – М.: Арт-родник, 2007. – 179 с.